*Міністр замежных спраў*

Мінск, 23 ліпеня 2017 года

Ваша Экселенцыя,

Дазвольце павіншаваць Вас з нагоды знамянальнай даты ў гісторыі нашых краін – 25-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Султанатам Аман.

У гэты перыяд Беларусь і Аман здолелі закласці трывалую аснову дружалюбных і ўзаемавыгадных стасункаў.

Паспяховы візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Султанат Аман у 2007 годзе пацвердзіў зацікаўленасць кіраўніцтва нашых краін рухацца наперад у справе развіцця двухбаковых сувязей.

Значная актывізацыя кантактаў у апошнія два гады, абмен візітамі ўрадавых, дзелавых і парламенцкіх дэлегацый адкрываюць шырокія перспектывы для беларуска-аманскага супрацоўніцтва ў палітычнай, гандлёва-эканамічнай і гуманітарнай сферах.

Спадзяюся, што прапанаваная беларускім бокам Праграма прыярытэтных крокаў па развіццю ўзаемадзеяння паміж Рэспублікай Беларусь і Султанатам Аманам стане эфектыўным інструментам выканання дамоўленасцей, дасягнутых у ходзе майго візіту ў Маскат у сакавіку гэтага года.

Прыміце, Ваша Экселенцыя, пажаданні моцнага здароўя і поспехаў у адказнай дзяржаўнай дзейнасці, а таксама запэўненне ў маёй вельмі высокай павазе.

Уладзімір Макей

**Яго Экселенцыі**
**Спадару Юсуфу бен Алаўі бен Абдале**
**Міністру, адказнаму за Замежныя Справы**
**Султаната Аман**
**Маскат**